EQUIS с финансированием через программы ЕС. Бизнес-школы Центральной и Восточной Европы (ЦВЕ) создали платформу с CEEMAN, чтобы способствовать созданию сетей взаимодействия как промежуточного шага к аккредитации AACSB и EQUIS.

Практика аккредитации начала распространяться по странам ЦВЕ в течение первого десятилетия нового столетия. Регион ЦВЕ по-прежнему отстает от многих других регионов по количеству аккредитованных бизнес-школ.

По состоянию на январь 2017 г. 77 бизнес-школ в мире имеют тройную аккредитацию или аккредитацию «тройной короны», состоящую из наиболее востребованных международных аккредитаций: AACSB, AMBA, EQUIS, 68,2% из которых составляют европейские бизнес-школы. Пока в Беларуси нет ни одного учебного заведения, имеющего хотя бы одну из данных аккредитаций.

Наиболее актуальными вопросами, на которые необходимо обращать внимание белорусским бизнес-школам при подготовке к началу процесса получения международной аккредитации, являются:

– готовность администрации бизнес-школы к изменениям;

– отношение преподавательского состава к международным требованиям оценки качества образовательного процесса;

– способность коллектива разработать стратегическую бизнес-модель развития бизнес-школы и осуществить ее реализацию;

– соответствие стандартов функционирования зарубежных бизнес-школ белорусским реалиям.

## МЕСЦА БІЗНЕС-АДУКАЦЫІ Ў СІСТЭМНЫМ АПІСАННІ СУЧАСНАЙ КАНСТРУКЦЫІ НАЦЫІ-ДЗЯРЖАВЫ

**Астапенка Анатоль Уладзіміравіч**
Інстытут бізнесу і менеджменту тэхналогій БДУ, Рэспубліка Беларусь
astap_2004@tut.by

Сучасная парадыгма бізнес-адукацыі патрабуе выкарыстання новых адукацыйных тэхналогій, сярод якіх усё большае значэнне і попыт заваёўваюць сістэмны падыход і многаўзроўневая іерархічная тэорыя сістэм. У прапануемай працы прааналізавана месца бізнес-працэсаў і адпаведна бізнес-адукацыі ў адзіным сістэмным апісанні дзяржаўнага будаўніцтва Рэспублікі Беларусь.

У прапануемай мадэлі сучаснай канструкцыі нацыі-дзяржавы паказана, што вышэйшым іерахічным узроўнем у стратыфікацыі стутусу дзяржавы з’яўляецца ўзровень нацыі, на якім фармулюеца такое універсальнае паняцце як нацыянальная ідэя.

На сустрэчы з прадстаўнікамі грамадскасці, беларускіх і замежных СМІ 3 лютага 2017 г. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь сказаў, што грамадзяне пакуль не прыйшлі да стварэння нацыянальнай ідэі і пры гэтым выдумаць яе немагчыма. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў краіне ўжо доўгі час спрабавалі сфармуляваць нацыянальную ідэю, прычым да працэсу падключылі розных экспертаў і грамадскіх дзеячаў [2].

Прапанаваны намі інавацыйны падыход, на нашу думку, дазваляе акрэсліць магчымыя шляхі далейшага будаўніцтва беларускай нацыі-дзяржавы і адпаведна акрэсліць падыходы да фармулявання беларускай нацыянальнай ідэі.

Сучасныя ўяўленні аб дзяржаве складаюцца са шматлікіх законаў і правілаў, якія замацоўваюцца ў асноўным законе – Канстытуцыі дзяржавы. Зыходзячы з неабходнасці ўліку ўсяго спектра, які ахоплівае жыццядзейнасць грамадзяніна любой краіны, нам падаецца найбольш аптымальным і мэтазгодным выкарыстаць дзеля апісання тэорыю многаўзроўневых іерархічных сістэм [3; 5].

Асноўны закон многаўзроўневых іерархічных сістэм – гэта апісанне на аснове наступнага сцвярджэння: усе страты ўзнікаюць з ніжняй страты шляхам множання і аб’яднання, стварэння больш вышэйшай страты і яе змены з дапамогай актыўнасці вышэйшай страты. Гэта ёсць асноўны закон іерархічнай матэматыкі – АЭД-тэорыі [3; 5].

Механізм кіравання (энергія) рэалізуецца сродкамі асноўных напрамкаў кібернетыкі. Гэта праектаванне, кантроль і навучанне – стадыі працэсу кіравання. Стадыя праектавання ёсць акт аб’яднання, а стадыя навучання ёсць акт множання (працэс кантролю звязвае абедзве гэтыя стадыі). З гэтага пункта гледжання іерархічная матэматыка – гэта тэорыя кіравання. Дзякуючы гэтаму працэс бізнес-адукацыі патрабуе свайго дакладнага вызначэння, які прымае пад увагу сваю сувязь з усім матэматычным статусам.

У працах [1; 4; 5] дадзена сістэмнае апісанне дзяржаўнага канструявання, распрацаваны адпаведныя ўмовы ўладкавання заканадаўства дзяржавы. Тэорыя іерархічных многаўзроўневых сістэм [4] усведамляе дзяржаву як сістэму ўзроўня ведаў. Як адзінка ўзроўню ведаў, дзяржава ўтрымлівае сістэмы ўсіх узроўняў: прыродных (фізічны, хімічны і біялагічны), дэмаграфічнага, вытворчага і творчага (у тым ліку светапогляд, мова, мастацтва, навука і канструяванне). Яна мае навакольны свет (іншыя дзяржавы), і ўдзельнічае ў дзеючых інстытутах наддзяржаўнай

улады і ў руху складання новай улады свету. Усе згаданыя ўзроўні (колы, страты) рухомыя, маюць непасрэдныя сувязі адзін з адным. Зыходная парадыгма тэорыі: стан страт, накіраваных на ўладкаванне ўсіх узроўняў дзяржавы, вызначаецца як падуладны ўзроўню ведаў (пануючаму ў дадзены момант).

Асобныя страты дзяржавы падзяляюцца на прыродныя, дэмаграфічныя, вытворчыя, творчыя, асветы і мастацтва і разгледжаны ў працах [1; 3; 4; 5]. Асноўны сродак уладкавання ўсіх гэтых страт – новыя веды аб кожнай з іх, што мусяць быць створаныя. З'яўленне новых ведаў аб усіх колах Беларусі патрабуе стварэння новых і ўдасканалення вядомых тэхналогій уладкавання ведаў, здольных звязваць веды аб усіх стратах дзяржавы і ствараць новыя веды аб іх з улікам узаемадзеянняў на ўсіх узроўнях.

Усе разгледжаныя ўзроўні дзяржаўных страт, аднак, не ўлічваюць сучасных прадстаўленняў аб дзяржаве XXI стагоддзя: неабходна ўлічваць вызначальнае, апошняе на дадзеным гістарычным этапе звяно – тытульную нацыю дзяржавы.

Большасць дзяржаў (прынамсі, Еўропы) у XXI ст. сфарміраваліся з выразным нацыяналіным абліччам, якое ў ідэалагічным плане абгрунтоўваецца нацыянальнай ідэяй, а ў практычным наяўнасцю нацыі. Таму правільным будзе разглядаць дзяржаву не як абстрактную, безнацыянальную групоўку грамадзян, а як нацыю-дзяржаву, дзе ўзровень нацыі – як паказана ў [1] – вышэйшы ўзровень эвалюцыі чалавецтва на дадзеным гістарычным этапе.

Істотным крокам у сучасным разуменні нацыі з'яўляецца, на нашу думку, тое, што нацыя набывае сваё сапраўднае аблічча, сваю поўную моц толькі тады, калі фарміраванне этнасу заканчваецца замацаваннем яго тэрытарыяльных меж юрыдычнымі актамі і абвяшчэннем дзяржаўнай незалежнасці. Такім чынам, мае сэнс гаварыць не проста аб нацыі, а аб нацыі-дзяржаве.

У сістэмным апісанні дзяржавы сучаснае разуменне нацыі-дзяржавы вымагае вылучэння самой нацыі, якое, па-сутнасці, тоеснае дзяржаве, на самы вышэйшы ўзровень шматузроўневай схемы статусу ладу дзяржавы.

Тым чыннікам, які яднае і ўздзейнічае на ўсе ніжэйшыя ўзроўні, з'яўляецца нацыянальная ідэя (НІ). Нацыянальная ідэя падобна крыві, якая напаўняе цела – нацыю-дзяржаву, дае ёй поўнае дыханне і робіць яе дзеяздольнай, жыццядайнай. Без нацыянальнай ідэі немагчыма функцыянаванне нацыі-дзяржавы. Яна (НІ) альбо займае дастойнае месца ў жыцці дзяржавы і тады нацыя-дзяржава ўліваецца ў сусветную сям'ю іншых краін, альбо яна падаўляецца іншай нацыянальнай ідэяй і тады этнічная група, што імкнулася ўтварыць нацыю-дзяржаву, уліваецца ў

іншы этнас, даючы дадатковыя «гармоны» ў фармаванне гэтага больш моцнага этнасу. Але гэта зусім не азначае барацьбу паміж этнасамі ці нацыямі за выжыванне «мацнейшага». Наадварот, развітыя нацыі імкнуцца дапамагаць этнасам, якія цалкам яшчэ не сфармаваліся ў нацыянальныя дзяржавы. Але гэта ў ідэале. На самой справе блізка разумеюць неабходнасць нацыянальнага развіцця толькі тыя нацыі, што самі ўступілі на гэты шлях ці нядаўна яго прайшлі. Такі працэс назіраецца цяпер на тэрыторыі постсавецкіх краін і краін Усходняй Еўропы.

Усе магчымыя ўзроўні сістэмнага апісання дзяржавы, згодна з нашым падыходам, адлюстроўваюць сучасныя прадстаўленні аб нацыі-дзяржаве. Яны ўтрымліваюць азначэнні ўласнага ладу дзяржавы, яе мэты, заканадаўства і навакольны свет – іншых суседніх дзяржаў, звязаных законамі руху іх змен.

Лад усіх дзяржаў азначаецца адзіным выразам, адпаведным гістарычна складзенай прасторы вядомых узроўняў свету. Гэты выраз утвораны звязанымі выразамі канкрэтных узроўняў.

Іерархічная лесвіца сістэмнага апісання дзяржавы ад ніжэйшага (прыроднага) да вышэйшага (нацыянальнга) узроўню выглядае наступным чынам.

Прыродны ўзровень (фізічнага, хімічнага і біялагічнага) – частка прыроды, дзе найменей адчуваюцца ўздзеянні пануючых узроўняў. Яго можна пазначыць як вольная прырода. Вытворчасць на ўзроўні прыроды: біяінжынерыя, сельская гаспадарка, хімічная прамысловасць.

Дэмаграфічны ўзровень. (Вытворчасць на дэмаграфічным узроўні).

Вытворчы ўзровень (Менеджмент у вытворчасці, гандаль. Навука і асвета ў вытворчасці).

Узровень ведаў, які падзяляецца на:

ніжэйшы ўзровень рацыянальных ведаў (навука і тэхніка, кіраванне бізнес-працэсамі, бізнес-адукацыя, дзяржаўныя інстытуты);

вышэйшы – трансцэндэнтных (законы судовай і выканаўчай улады ідэалогія дзяржавы, мастацтва і літаратура)

Узровень нацыі-дзяржавы.

Усведамленне дзяржавы разгортваецца ў канкрэтныя азначэнні яе геафізічных і геахімічных умоў (нетраў з карыснымі выкапнямі, глебы, вады, паветра), расліннага і жывёльнага свету. Часткі прыроды зменены дзейнасцю пануючых узроўняў азначаюцца з улікам гэтых змен і адзнак іх карыснасці ў пануючых узроўнях (дэмаграфічным, вытворчым і ведаў).

Уздзеянне ўзроўню нацыі-дзяржавы праз нацыянальную ідэю праяўляецца на ўсіх узроўнях, але найбольш яно выражана на бліжэйшым да яе ўзроўні трансцэндэнтных ведаў. Са статусу дзяржавы вынікае, што светапогляд самым непасрэдным чынам звязаны з нацыяй, што ў сваю

чаргу накладвае адбітак і вызначае кіраванне ніжэйшым (чацвёртым) узроўнем – кіраваннем, бізнес-працэсамі і, адпаведна, бізнес-адукацыяй.

ЛІТАРАТУРА


1. **Астапенка, А. У.** Нацыянальная ідэя ў сучасным свеце : манаграфія / А. У. Астапенка. – Мінск, 2003. – 184 с.

2. **Интернет-телеканал** ONT.BY. [Электронный ресурс]. – 2017. – Режим доступа: http://ont.by/news/our_news/aleksandr-lykashenko-rasskazal-o-nacionalnoj-idee.

3. **Новікава, С. І.** Аэд: стандартны блок іерархічных многаўзроўневых сістэм / С. І. Новікава, К. М. Мятлюк // Теория и методы автоматизации проектирования сложных систем и автоматизации научных исследований. – Минск, 1990. – С. 39–49.

4. **Остапенко, А. В.** Нация как страта высшего уровня государства с точки зрения иерархической математики / А. В. Остапенко // «Наука – образованию, производству, экономике. БНТУ-2011» : тезисы доклада. Материалы Девятой научно-технической конференции : в 4 т. Т. 2. – Минск.

5. **Novikava S. et al.** (1997). The Statute of Hierarchical Mathematics and Its Cybernetical Maintenance. *Preprints of Eleventh International Conference Modelling and Scintific Computing.* P.149. Washington, D.C., USA.


## КОРПОРАТИВНОЕ ОБУЧЕНИЕ НА БАЗЕ ИНТЕЛЛЕКТУАЛЬНЫХ ОБРАЗОВАТЕЛЬНЫХ СРЕД


**Афанасьев Александр Николаевич**
**Тимофеева Оксана Геннадьевна**
Ульяновский государственный технический университет, Российская Федерация
a.afanasev@ulstu.ru


Необходимость развития кадрового состава предприятия определяется современными рыночными условиями, требующими внедрения инновационных методов организации производства и новых образцов техники.

С организационной точки зрения для решения этой проблемы в настоящее время широкое применение в мировой практике нашли корпоративные университеты, предназначенные для формирования профессиональных компетенций и корпоративной культуры. В России насчитывается более 30 таких университетов: ОКБ Сухого, «Ростелеком», «Северсталь», группа компаний «Волга-Днепр», Объединенная авиастроительная корпорация и др.